ТРЫ ДНІ — І ДРОВЫ НА ДВАРЫ 3

РАБІЦЬ ВЫСНОВЫ НА ЧУЖЫМ ДОСВЕДЗЕ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

7 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 197 (29819)

КАРАТКА

- Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сёння зробіць рабочы візіт у Расійскую Федэрацыю. У рамках візіту ён прыме ўдзел у нефармальным саміце кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД.
- **У краіне плануюць укараніць паслугу па высылцы адпраўленняў праз паштамат.**
- У ВНУ Беларусі плануюць увесці ўнутраны экзамен па першым профільным прадмеце.

ЦЫТАТА ДНЯ

Леанід БРЫЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў:

«Законапраект «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці» — дастаткова аб'ёмны, сур'ёзны дакумент, які сёння запатрабаваны і вельмі неабходны як у цэлым нашай эканоміцы, так і бізнес-супольнасці. Кіраўніком дзяржавы пастаўлены патрабаванні, каб не проста правесці банкруцтва прадпрыемстваў, а максімальна рэанімаваць, правесці санацыю гэтых прадпрыемстваў. І мы хочам звярыць з мясцовымі органамі ўлады ключавыя моманты перад канчатковым вынясеннем законапраекта ў другім чытанні ў Авальную залу. На месцах лепш відаць, як прадпрыемствы працуюць, чым яны дыхаюць, каб максімальна захаваць калектывы. Гэта значыць, зняць вялікую нагрузку з судоў і перанесці на мясцовыя органы ўлады. Гэта датычыцца ўсіх формаў уласнасці, як дзяржаўных, так і камерцыйных».

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 22197

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ТАВАРНАГА ДЭФІЦЫТУ Ў КРАІНЕ НЕ БЫЛО І НЕ БУДЗЕ — ГЭТА Я ЛЮДЗЯМ ГАРАНТУЮ»

З учарашняга дня па распараджэнні Прэзідэнта ўведзена забарона на бескантрольнае павышэнне цэн

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з эканамічным блокам урада. Шэраг актуальных пытанняў сталі прадметам размовы. Аднак галоўнае, на чым была засяроджана самая сур'ёзная ўвага як кіраўніка дзяржавы, так і астатніх удзельнікаў нарады, — цэнавая сітуацыя ў краіне.

Фота БелТА.

«УВЕСЬ СВЕТ АШАЛЕЎ АД ГЭТАЙ ІНФЛЯЦЫІ»

«За восем месяцаў бягучага года інфляцыя склала звыш 13 %, амаль 14 %. У цэлым, як мне паведамляюць, за год урад плануе мець 19 %. Гэта значыць, за перыяд часу, які застаўся, вы хочаце яшчэ больш павысіць цэны? Я правільна разумею?» — звярнуўся да прысутных кіраўнік дзяржавы.

Па словах Прэзідэнта, на такія высокія значэнні інфляцыі Саўмін і Нацбанк павінны былі адказаць жорсткімі мерамі па стрымліванні цэн. «Маю на ўвазе, 13—14 % гэта ўжо нікуды не варта, — удакладніў ён. — І тыя, хто павінен стрымліваць інфляцыю, павінны былі адрэагаваць. Паглядзім, як рэагуюць. Рост цэн нівеліруе ўсе нашы намаганні па павышэнні заробкаў і пенсій. Рэальныя даходы насельніцтва ўпалі ніжэй за ўзровень мінулага года, прыкладна на 3 %. Рэальныя даходы насельніцтва, клопат аб народзе — гэта, акрамя Прэзідэнта, перш за ўсё чый клопат? Сёння нам трэба дасканала разабрацца ў прычынах сітуацыі, якая склалася, — як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных — і прыняць канчатковае рашэнне».

СТАР. 2

А ў нас — усюды газ!

Фота БелТА.

Днямі ў аграгарадку Свяцілавічы Бялыніцкага раёна ўрачыста запусцілі прыродны газ. Гэта знакавая падзея для ўсяго раёна — цяпер усе сем аграгарадкоў газіфікаваныя. Будаўніцтва падводзячага газаправода да Свяцілавічаў праходзіла па дзяржаўнай праграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021—2025 гады. Падача прыроднага газу забяспечыць палівам увесь жыллёвы фонд населенага пункта — 152 індывідуальныя жылыя дамы, якія да гэтага выкарыстоўвалі звадкаваны газ у балонах, і 20 кватэр.

Спажывец

ГРЫБНЫЯ МЕСЦЫ

Даведаліся, колькі каштуюць баравікі, чырвонагаловікі, лісічкі і масляты на нашых рынках

Гэтая восень, на жаль, не падарыла грыбнікам раздолле для «ціхага паляванння». Але грыбы ў лясах усё ж ёсць, распавялі на сталічнай Камароўцы. Праўда, гэта той выпадак, калі «трэба ведаць месцы»: у гэтым не грыбным годзе «сезам» адкрываецца далёка не ўсім, хто вырашыў пахадзіць па лесе пад дробным восеньскім дожджыкам...

Грыбныя месцы ў ваколіцах буйных гарадоў — традыцыйная восеньская тэма. У сталічнай вобласці, напрыклад, грыбнымі лічацца лясы паблізу Плешчаніц і ў цэлым Лагойскі раён, а таксама лясныя масівы паміж Маладзечнам і Вілейкай. Зрэшты, кілаграмовы баравік гэтай восенню быў знойдзены нават бліжэй да МКАД. Яго выклалі ў TikTok, і відэа набрала сотні тысяч праглядаў. Гісторыя мела працяг — потым шчаслівцы паказалі таксама відэа з батарэяй слоікаў-закрутак з аднаго-адзінага грыба.

СТАР. 4

«ТАВАРНАГА ДЭФІЦЫТУ Ў КРАІНЕ НЕ БУДЗЕ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сувязі з гэтым беларускі лідар чакае ад ўрада і Нацыянальнага банка дзейсных прапаноў па ўтрымленні цэнавага росту. Пастаўлена задача — вярнуцца ў наступным годзе да ўзроўню інфляцыі 7-8 %.

«Зразумела, ёсць аб'ектыўныя для нас фактары, калі з-за бяздумнага ўвядзення санкцый заходнімі краінамі парушыўся звычайны ўклад сусветнага гандлю, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Як вынік, ***шматгадовыя антырэкорды па інфляцыі фіксуюцца ва ўсім свеце. Рост цэн, інфляцыя — гэта не вынаходніцтва Беларусі. Увесь свет ашалеў ад гэтай інфляцыі.*** Дапусцім, у Амерыцы рост цэн на прадукты стаў самым істотным з 1979 года. Амаль паўвека таму такое было ў Амерыцы. У Еўрасаюзе пабіты рэкорд за ўвесь час існавання адзінай еўрапейскай валюты, еўра (з 1 студзеня 1999 года). У нашых суседзяў: у Эстоніі гадавая інфляцыя перавышае 25 %, у Латвіі і Літве — звыш 20 %». Ці тое яшчэ будзе».

Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што можна збольшага зразумець рост цэн на імпартныя тавары. ***«Але чаму мы назіраем пастаянае павышэнне кошту таго, што вырабляем самі з айчыннай сыравіны?*** — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы. — Цэны на сыравіну не выраслі, на паліва і іншае — нафту, газ, таксама не выраслі? Харчовыя тавары падаражэлі амаль на 13 % з пачатку года. Цэны растуць нават на пазіцыі штодзённага попыту, кантроль за якімі самы жорсткі з боку дэпутатаў, прафсаюзаў і Камітэта дзяржкантролю, пра губернатараў ужо і не кажу».

Прэзідэнт вымушаны быў умяшацца ў сітуацыю. Па яго словах, ужо відавочна, што ўрад, прафсаюзы, аблвыканкамы, Мінгарвыканкам, дэпутаты, Камітэт дзяржкантролю не спраўляюцца з цэнамі, якія растуць. «Ёсць факты неабгрунтаванага павышэння цэн вытворцамі прадукцыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Тое, аб чым я казаў. Лес як быў, так і застаўся на тэрыторыі Беларусі. Малако, мяса, яйкі як выраблялі тут летась, так выраблялі і ў гэтым годзе. І ўгнаенні, і крэдыты, і разлікі з сельскай гаспадаркай, і паліва, і газ, і нафта ды іншае — бяры не хачу. Таму пытанні да таварывытворцаў».

«ПАСРЭДНІЦТВА ЎВОГУЛЕ БЫЦЬ НЕ ПАВІННА»

Спыніўся кіраўнік дзяржавы і на нядобрасумленным пасрэдніцтве. Пры гэтым заявіў, што ніякага пасрэднiцтва ўвогуле быць не павінна. ***«У нас дайшлі да таго, што ад курыцы ўзяў яйка хтосьці, прывёз у краму — пасрэднік, гандляры прадалі, у тры разы цану павысілі,*** — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. — У тры разы! Лягчэй і танней гэтую курыцу вырасціць, чым яе прадаць. ***Калі ў нас ёсць пасрэднікі на знешніх рынках, то верхаводзіць там павінны тыя, хто прадае прадукцыю. Калі мы прадаём трактар за межы краіны, пасрэднікі калі і будуць, то там верхаводзіць павінен МТЗ.*** Узвінчваючы гандлёвыя надбаўкі на сотні працэнтаў, мы таксама павышаем цэны. Пры гэтым мы тым самым немалыя грошы з бюджэту на падтрымку сельгасвытворцаў, танныя крэдыты для перапрацоўчых прадпрыемстваў, ствараем спрыяльныя ўмовы для размяшчэння і работы гандлёвых аб'ектаў. Аднак на фоне ўсіх гэтых мер малако, мяса, хлеб, крупы і іншая сацыяльна значная прадукцыя працягваюць даражэць кожны месяц».

Кіраўнік дзяржавы лічыць няправільным дзяліць прадукцыю на значную і нязначную. Такога паняцця, як «сацыяльная значная прадукцыя», па яго словах, быць увогуле не павінна.

«Яшчэ горшая сітуацыя з нехарчовымі таварамі, цэны на якія выраслі з пачатку года на 18 %, — канстатаваў беларускі лідар. — Калі гэта Adidas, Nike ці Zara, ладна. Калі нехта хоча гэтае імпартнае па шалёных цэнах набываць, няхай купляюць. Але ў нас жа і на айчынныя абутак і адзенне выраслі цэны».

Што датычыцца некаторых дзялкоў, тут, па яго словах, увогуле ўсё празрыста. ***«Спачатку ўзвінцілі цэны на курс, які падрос, а калі наш рубель умацаваўся, адкруціць цэннік назад чамусьці «забыліся»,*** — адзначыў Прэзідэнт і тут жа задаў пытанне прысутным: — А той, хто заўважыў, чаму не ўстанавіў справядлівасць?!»

Кажучы аб неабгрунтаваным пасрэдніцтве, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на зборах вытворча-збытавых ланцужкоў лёгка нажываюцца спекулянты. ***«Камітэт дзяржкантролю дакладвае: ёсць факты, калі яблыкі, цыбулю, буракі і капусту, вырашчаныя нашымі сельгаспрадпрыемствамі, бюджэтнікі закупілі ў пасрэдніка з нацэнкай пад 300 працэнтаў!*** — прывёў прыклад ён. — Не апошняя роля ў пытанні цэнаўтварэння ў Нацыянальнага банка. Курсавы фактар цісне на кошт тавараў, якія мы вымушаны імпартаваць. Імпарцёры чамусьці ўпарта працягваюць закладваць у кошт тавару курсавыя рызыкі, хаця курс беларускага рубля стабільны. Павінна быць уведзена адказнасць за абгрунтаванасць цэн імпарту і наладжана сістэма. І гэтая сістэма павінна быць падкантрольная».

Асаблівую ўвагу, па словах беларускага лідара, трэба ўдзяліць крытычнаму імпарту. «Хто стаіць за гэтымі пастаўкамі, па якіх цэнах ажыццяўляецца ўвоз тавараў і які іх кошт у канчатковым выніку на паліцы крамы? — пацікавіўся ён. — ***Тут трэба пільна паглядзець на імпарцёраў, выключыць спекуляцыі на рынку імпартных тавараў***. Таксама мне дакладваюць аб практыцы абходу антыінфляцыйнага заканадаўства шляхам павышэння цэн на тавары пад выглядам новага тавару. Напрыклад, «новы» хлеб або разбіранне тушак на часткі. А людзі вымушаны купляць тыя ж прадукты, але чамусьці па больш высокай цане. Разумееце, да чаго дайшлі. ***Цэлая тушка курыныя каштуе два рублі, а напалову раздзеленая — пяць рублёў, напрыклад. Што адбылося? Чаму ў два-тры разы падаражэў тавар? Таму, што мы яго напалову разрэзалі?»***

Аляксандр Лукашэнка загадаў навесці парадак і ў гэтым пытанні. Яшчэ адно патрабаванне Прэзідэнта — на прылаўках павінны быць тавары належнай якасці, у шырокім асартыменце і па справядлівых цэнах. А так званая новая прадукцыя, калі яна і будзе, павінна па сваіх спажывецкіх якасцях адрознівацца. ***«Таварнага дэфіцыту ў нас не было і не будзе — гэта я людзям гарантую»,*** — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

ВЫНІКІ МАНІТОРЫНГУ ЦЭН І РАБОТА СПАЖЫЎКААПЕРАЦЫІ

Прэзідэнту далажылі інфармацыю аб бягучым становішчы цэн на спажывецкім рынку, аб прычынах высокай інфляцыі, а таксама мерах, якія трэба прымаць, каб стрымаць далейшае становішча цэн і абараніць людзей.

Старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна Мядзведзева адзначыла, што высокая прадуктовая і не толькі інфляцыя «з'ядае» даходы насельніцтва і прыводзіць да зніжэння пакупніцкай здольнасці. Па яе словах, рост цэн на харчовыя тавары ў гандлёвых сетках абумоўлены павышэннем цэн па ўсім ланцужку: пачынаючы ад сельскагаспадарчых арганізацый і вытворцаў, заканчваючы паступленнем іх у рознічны гандаль. «Улічваючы сітуацыю, якая склалася на спажывецкім рынку рэспублікі, мяркую мэтазгодным устанавіць дзяржаўнае рэгуляванне цэн на суб'екты гаспадарання: пачынаючы ад вытворцаў і заканчваючы гандлёвымі сеткамі, — прапанавала яна. — Забараніць рэгістрацыю новых тавараў пры нязначным змяненні іх спажывецкіх якасцяў. Выпрацаваць дакладную сістэму фарміравання сабекошту сезонных тавараў, асабліва па цяплічных камбінатах, з мэтай недапушчэння росту цэн у побытавым выяўленні і згладжвання сезонных хістанняў у пачатку сезона і на яго завяршэнні. Выпрацаваць механізм пераліку кошту імпартнай прадукцыі для ўсіх імпарцёраў».

Аб вынiках маніторынгу цэнаўтварэння на тавары ў рознічнай сетцы і на лекавыя сродкі ў аптэках далажыла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. Па яе словах, не ўсе гандлёвыя сеткі ў рэгіёнах добрасумленна выконваюць пастанову ўрада «Аб рэгуляванні цэн». «У верасні зафіксавалі 21 парушэнне, — паведаміла яна. — Захоўваецца дастаткова шырокі роскід цэн у рэгіёнах на адны і тыя ж тавары. Напрыклад, у межах Мінскай вобласці цэны на капусту за верасень ва Уздзе знізіліся на 47 %, а ў Мар'інай Горцы павялічыліся на 110 %. Такая ж сітуацыя і з бульбай: цана ў Кобрыне на бульбу знізілася на 33 %, а ў Фаніпалі павялічылася на 40 %. Нават у розных крамах адной сеткі цана на адзін і той жа тавар можа быць рознай. Усе яны ў першую чаргу арыентуюцца на пакупніцкую здольнасць спажыўца».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка праінфармаваў Прэзідэнта аб выніках маніторынгу цэн на харчовую прадукцыю дэпутацкім корпусам. У якасці прыкладу ён расказаў, як часам фарміруюцца цэны на плодаагароднінную прадукцыю. Па яго словах, у гандлёвых сетках тыя ж яблыкі прадаюцца па дватры з паловай рублі за кілаграм, а з прыватных падворкаў людзі прадаюць яблыкі па 80 капеек за кілаграм. На нарыхтоўку вытворцы купляюць яблыкі ўвогуле за 20 капеек. І гэта датычыцца не толькі яблык.

«Трэба, каб нашыя грамадзяне мелі магчымасць зарабіць на сваёй зямлі і прадаваць тавар Белкаапсаюзу не дзесьці, а проста, будзем казаць, не выходзячы са свайго двара, — унёс прапанову Уладзімір Андрэйчанка. — Мы сёння вядзём пытанне, што трэба ў кожным рэгіёне стварыць новае прадпрыемства. Аднак у свой час практычна ў кожным раённым цэнтры былі ўласныя перапрацоўчыя магутнасці, загрузка якіх забяспечвалася мясцовай сыравінай. Думаю, што наспела магчымасць, у першую чаргу для Белкаапсаюза, адрадзіць гэтыя добрыя традыцыі, унёсшы ўклад у вырашэнне пытання занятасці нашага насельніцтва ў вёсцы».

Па даручэнні Прэзідэнта, спікер ніжняй палаты парламента разам з дэпутатамі возьмуць на кантроль работу спажыўкааперацыі.

«ДАЛЕЙ ЦЭНЫ ПАВЫШАЦЬ НЕЛЬГА»

З 6 кастрычніка, па распараджэнні беларускага лідара, у краіне ўведзена забарона на павышэнне цэн. Аднак, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, выключэнні могуць быць па тых ці іншых пазіцыях. Прэзідэнт прызначыў адказных за прыняцце падобных рашэнняў: міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю, старшыняў аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама. «Без іх дазволу ніякая цана прырастаць не можа да таго, што ёсць на сённяшні дзень», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы і патлумачыў, чым выклікана такое рашэнне: «Бо цэны пасля ўсплёску ашалелага яшчэ выраслі на столькі ж. ***І цэны сёння не маюць межаў. Яны ўпёрліся ў столь. Далей цэны павышаць нідзе нельга. Няма неабходнасці. Аднак бываюць выключэнні. І гэтыя выключэнні пад кантролем міністра і губернатараў».*** Пры тым Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў: на гэтым фоне не павінна быць закрыццяў аб'ектаў і спроб сысці з рынку.

Групе адказных асоб на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай даручана ўнесці ва ўрад прапановы па мерах рэгулявання цэн у Беларусі. Звяртаючыся да першага віцэ-прэм'ера Мікалая Снапкова, Аляксандр Лукашэнка парэкамендаваў не толькі не павышаць цэны з 6 кастрычніка, а, наадварот, знайсці магчымасць іх панізіць.

Была ўзнята падчас нарады і тэма сельскай гаспадаркі. «Сельскагаспадарчы год мы павінны скончыць апошнім гектарам пад'ёму зяблева: яно павінна быць паднята, як у мінулым годзе», — паставіў задачу беларускі лідар. Па меркаванні спецыялістаў, без гэтага не ўдалося б атрымаць высокага ўраджаю, які мы маем сёлета. «У нас сёння самае небяспечнае — не скончылі сяўбу азімых, а гэта ўраджай будучага года, — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. — Кіньце зерне неадкладна ў грунт. Трэба скончыць сяўбу. Гэта галоўнае. Другое — сабраць кукурузу на зерне. Гэта другая праблема, якую трэба імгненна вырашыць». Адпаведныя задачы пастаўлены па ўборцы бульбы, цукровых буракоў і лёну.

Вераніка КАНЮТА.

Сітуацыя

КАЛІ ПРЫВАТНЫ ДОМ ПАВІННЫ ЗНОСІЦЬ ЗА КОШТ ГАРАДСКОГА БЮДЖЭТУ?

Кватэрнае пытанне і медпаслугі для пенсіянеркі з Украіны сталі прадметам гаворкі на прыёме грамадзян у старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля ІСАЧАНКІ.

Маці з дачкой з Магілёва звярнуліся да губернатара з набалелым для іх пытаннем. Яны жывуць у прыватным доме, які апошнія пяць гадоў рыхтуюць пад знос. Спачатку абяцалі знесці яго на працягу года, а потым працэс запаволіўся.

— Наш дом знаходзіцца на схіле і яго пастаянна падтоплівае, бо вадасцёкавы жолаб пашкоджаны, — скардзіліся жанчыны. — На нашы звароты мясцовыя органы ўлады рэагуюць вяла, даюць нейкія адпіскі. Яшчэ з 2005 года абяцалі, што на пляцоўцы, дзе стаіць наш дом, будзе будавацца комплекс «Маладосць». Але нашы чаканні не спраўдзіліся. Спецыялісты тлумачаць, што хоць дом і знаходзіцца ў цэнтры горада, жадаючых распачаць на яго месцы будаўніцтва сапраўды няма. Планавалася ўзвесці камерцыйны дом на 40 кватэр, але падлічылі, што прыйдзецца несці вялікія выдаткі — у доме прапісана дзевяць чалавек.

Губернатар даў даручэнне праверыць дом і разабрацца, чаму яго падтоплівае. Калі спатрэбіцца, зрабіць ліўнеўкі. Акрамя таго, трэба размясціць на сайтах гарвыканкама і аблвыканкама аб'явы з мэтай знайсці інвестара для забудовы дадзенай пляцоўкі.

«Парадак мы навядзём, — паабяцаў заяўніцам Анатоль Ісачанка. — Але ваш дом прыватны і мы не абавязаныя яго зносіць. Гэта адбудзецца толькі тады, калі знойдзецца інвестар».

Праблемы са здароўем прымусілі жыхарку Украіны звярнуцца па дапамогу. Яна паведаміла, што ў 2020-м купіла дом у Магілёўскім раёне і пераехала туды жыць. Пенсію атрымлівала ўкраінскую. Але калі на радзіме пачаліся ваенныя дзеянні, картку заблакіравалі і ўжо сем месяцаў на яе не паступаюць грашовыя сродкі. Між тым пачаліся праблемы са здароўем, прыйшлося аператыўна рабіць платную аперацыю. Хутка намячаецца яшчэ адна, але грошай на яе няма. Каб аперацыю зрабілі бясплатна, павінна быць пасведчанне на права жыхарства або пастаянная прапіска. Але, як ёй растлумачылі ў міграцыйнай службе, грамадзянства можна атрымаць толькі пасля пяці гадоў пражывання ў краіне. Губернатар даручыў узяць жанчыну пад патранаж і дапамагчы ў бядзе.

— Існуе Указ Прэзідэнта № 326 ад 24.09.2022, дзе ў адносінах да грамадзян Украіны ўнесены змяненні, у тым ліку і наконт аказання медыцынскіх паслуг, — падкрэсліў ён. — На працягу двух дзён трэба ва ўсім разабрацца і дапамагчы чалавеку.

Пытанні ўзяты на кантроль, па іх вядзецца работа. У агавораны заканадаўствам тэрмін заяўнікі будуць праінфармаваны пра яе вынікі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

На слыху

ТРЫ ДНІ — І ПАЛІВА НА ДВАРЫ

Пра санітарныя высечкі, ландшафтныя біятопы і нарыхтоўку дроў

Сёлета Беларусь тройчы сутыкалася з моцнымі вятрамі, якімі было пашкоджана 4,4 мільёна м³ лесу. Гэтая лічба супастаўная з пашкоджаннямі лясоў у 2016 годзе, калі ў Смалявіцкім раёне бура палажыла 4,5-4,7 м³. Тады наступствы ліквідавалі цягам паўтара года. Сёлетнія бураломы леснікі павінны ліквідаваць аператыўна, каб захаваць тэхнічную якасць драўніны. У межах акцыі «Адновім лясы разам» з 8 да 22 кастрычніка Міністэрства лясной гаспадаркі мае на мэце аднавіць лясы ў Магілёўскай вобласці, якія былі пашкоджаны прыроднай стыхіяй. Тут плануюць засадзіць лесам каля 640 пашкоджаных гектараў. Сёлета ў краіне пасадзяць таксама каля 40 тысяч гектараў новага лесу. Пры гэтым з набыццём дроў у краіне праблем няма — два-тры дні — і паліва на двары, запэўнілі ў Мінлясгасе.

ДРОВЫ «ДЗЯРЖАЎНЫЯ» І «ПРЫВАТНЫЯ»

Сітуацыю з дровамі, як сведчаць леснікі, яны ўзялі на ручное кіраванне яшчэ напачатку года, памятаючы пра мінулагодні вопыт вялікіх чэргаў па гэтае паліва ў лясгасах і гартопах. Таму ў сярэднім па Беларусі насельніцтва сёлета чакала прывозу не больш за два-тры дні. Практычна сутакі — для тых, хто згодны на любы прыродны склад дроў (пераважна хваёвыя), да тыдня — для жадаючых набыць паколатыя дровы ці пэўных ліставых парод, расказаў **Аляксандр ДРАГУН, першы намеснік міністра лясной гаспадаркі**:

— З рэалізацыяй дроў няма складанасцяў. Мы заўжды маем стратэгічны недатыкальны запас каля мільёна кубічных метраў драўніны, каб аператыўна задаволіць дадатковы попыт на драўніну ў краіне, калі ён узнікне. Пэўны запас сфармаваны з тых жа бураломных лесасек. Ільготы на кошт паліва маюць уладальнікі паліўных кніжак (вясковыя жыхары з прапіскай — пастаяннай рэгістрацыяй). Па прэйскуранце — таксама нядорага, у залежнасці ад пароды дрэва, і таго, ці сечаныя паленні.

Сапраўды, калі права на льготы ў цябе ёсць, то дровы не здаюцца дарагімі. Прывяду лічбы ў адным з раёнаў краіны. Мясцовыя жыхары, якія маюць паліўныя кніжкі, згодна з нарматывам, могуць набыць на зіму па субсідуемым кошце 2,7 м³ дроў і 2,4 тоны брыкету. Калі чалавек адмаўляецца ад торфу, ён можа ўзяць ажно 4,9 м³ дроў коштам 225 рублёў. Да цаны паліва дадаецца і кошт дарогі на яго прывоз (калі не забіраеш сам). Для мясцовых гэтыя кіламетры таксама субсідуюцца, і калі сельсавет забяспечвае прывоз, на кошт гэта істотна не ўплывае.

Тыя, у каго льгот няма, мусяць плаціць напоўніцу. Розніца атрымліваецца важкая. Адзін кубаметр сечаных дроў, набытых у гартопе па вольным кошце (для тых, хто не мае пастаяннай рэгістрацыі на вёсцы), абыдзецца ў 98,66 рубля, плюс выдаткі на дарогу (каля 90 рублёў) — у выніку чатыры «кубы» абыдуцца амаль у 500 рублёў. А ў «прыватніка» можна той жа аб'ём (кошт дарогі закладзены ў суму) купіць за 340 рублёў. Такая розніца атрымліваецца з-за таго, што прыватнікі часта прадаюць дровы, ссечаныя незаконна, а лясгас нарыхтоўвае драўніну легальна, упэўнены Аляксандр Драгун:

— У дзяржаве існуе такое паняцце, як «дробны водпуск драўніны на корані», і мы актыўна прыцягваем да гэтага людзей. Яны могуць прыйсці ў лясніцтва, напісаць заяву і атрымаць 50 м³ лесу для нарыхтоўкі (праўда, не паўсюль). Пры гэтым ім трэба заплаціць зарплату работнікам, аддаць падаткі, так што і выніковы кошт не будзе меншы за лясгасны... А вось калі пілаваць лес нелегальна з мінімальнымі затратамі, то можна дазволіць сабе прадаваць танней.

НАТУРАЛЬНЫ АДПАД — ГЭТА НОРМА

Лес — гэта не парк, і наяўнасць пэўнага адпаду ў лесе — норма, засяродзіў ўвагу першы намеснік міністра:

— Мы часам сутыкаемся з такім падыходам, што любое дрэва, якое ўпала ў лесе, ці стаіць нахіленае або засохлае, павінна тэрмінова быць прыбранае. Аднак калі мы пачнём выбіраць з лесу ўсю такую драўніну, — лес перастане быць лесам. Такое паняцце, як натуральны адпад, ніхто не адменяў, і ён павінен быць. У нас ёсць рэкрэацыйна-аздараўленчыя лясы, якія прадугледжаны для адпачынку людзей, і іх мы прыбіраем у першую чаргу. А ёсць прыродаахоўныя лясы, рэдкія тыповыя ландшафтныя біятопы, 17 % лясоў знаходзяцца пад пэўнымі прыродаахоўнымі абмежаваннямі.

На ўборку паваленых бурай дрэў накіроўваюцца толькі найбольш вопытныя работнікі, якія маюць допускі з пункту гледжання аховы працы, падкрэсліў прадстаўнік Мінлясгасу, адказваючы на пытанне, чаму б звычайным беларусам таксама не дапамагчы ў расчыстцы завалаў і не нарыхтаваць сабе такім чынам дроў:

— Каб чалавек узяў бензапілу і звалiў дрэва правільна, не забіўшы самога сябе, існуе спецыяльнае навучанне, некаторых вучаць нават па некалькі гадоў. А звычайны чалавек хіба ведае, як спілаваць сухое дрэва ў лесе, каб не нашкодзіць сабе? І нават тыя дрэвы, што ўжо ляжаць, — як вы іх прывезяце? Для гэтага неабходны спецыяльная тэхналогія і тэхніка.

НЕ ПАТРЫВОЖЫЦЬ ЧОРНАГА БУСЛА

У студзені-лютым пацярпела амаль 28 тысяч гектараў лясоў і каля мільёна м³ драўніны. Падчас ліквідацыі

наступстваў гэтай стыхіі моцныя сакавіцкія вятры дадаткова пашкодзілі 11,5 тысячы гектараў (300 тысяч м³). На пачатку мая і чэрвеня прайшоў самы масавы ветравал на 37,5 тысячы гектараў (2,7 мільёна м³). Практычна палова з пацярпелага лесу хваёвыя і столькі ж — ліставыя, нагадаў першы намеснік міністра:

— Суцэльныя санітарныя высечкі мы павінны былі скончыць да 1 верасня, уборку ад захламленасці і правядзенне выбарачных санітарных высечак — а таксама засеяныя палі вакол лесу. З тэрыторый у 10 тысяч гектараў, якія падлягаюць суцэльным санітарным высечкам, 7,5 тысячы (2,4 мільёна м³) — у Магілёўскай вобласці, дадаў спецыяліст.

25 МІЛЬЁНАЎ НОВЫХ ДРЭЎ

Цяпер задача — максімальна хутка правесці лесаднаўленне на пацярпелых плошчах. І адна з мэт акцыі «Адновім лясы разам» — паказаць звычайным людзям праблему пашкоджання лясоў моцнымі вятрамі, каб яны таксама паўдзельнічалі ў рабоце і ўбачылі, у якіх умовах працавалі леснікі ўвесь год, у тым ліку на цяжкадаступных участках, акрэсліў Аляксандр Драгун:

— Мы прыкладаем максімум намаганняў, каб пасля рубак лесу ачысціць гэтыя ўчасткі, убраць усе вывараткі і стварыць умовы для якаснай пасадкі новых лясоў. Сёння плошча лесакультурнага фонду на ветравальна-бураломных участках — больш за пяць тысяч гектараў, 3,9 тысячы гектараў з якіх — на Магілёўшчыне. Да 1 чэрвеня 2024 года неабходна пасадзіць лес на ўсіх пашкоджаных тэрыторыях, а гэта 25 мільёнаў саджанцаў.

На пашкоджаных участках спатрэбіцца 43 % сасны, 36 % — елак, каля 11 % — дуба чарэшчатага, каля 7 % — алешыны чорнай і менш як па 3 % іншых ліставых дрэў. Вядома, такіх запасаў у лясгасаў той жа Магілёўшчыны няма, таму дапамогуць суседзі. Віцебская вобласць плануе, напрыклад, перадаць каля мільёна саджанцаў дубоў, Брэсцкая — каля 300 тысяч елак.

Ірына СІДАРОК.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 8 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатольевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

• першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Стральба ў дзіцячым цэнтры ў Тайландзе: 34 чалавекі загінулі

У выніку стральбы ў дзіцячым цэнтры ў Тайландзе загінулі 34 чалавекі, сярод іх 12 дарослых і 22 дзяцей. Пра гэта паведамляе тайландскае выданне Khaosod.

Паводле апошніх звестак, забойца ўцёк з месца злачынства, а пасля скончыў жыццё самагубствам. Акрамя таго, стала вядома, што напярэдадні мужчына застрэліў сваю жонку і дзяцей. Паведамляецца таксама аб 12 параненых, восем з якіх знаходзяцца ў цяжкім стане.

Раней стала вядома, што ўзброены мужчына 6 кастрычніка напаў на дзіцячы цэнтр на паўночным усходзе Тайланда. Удакладнялася, што здзейсніў гэта былы супрацоўнік паліцыі.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Каралю Тайланда Маху Вачыралангкорну Бодынтхаратхепхаявarангкуну і народу гэтай краіны ў сувязі з жахлівай трагедыяй у раёне На Кланг, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «У нашай краіне з жахам, смуткам і болем у сэрцы ўспрынялі навіны аб гэтым злачынстве. Мірныя беларусы самым рашучым чынам асуджаюць усе формы экстрэмізму. Трагічным падзеям, якія здарыліся ў На Кланзе, няма і не можа быць ніякага апраўдання», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы перадаў словы спадзячага спачування і падтрымкі сем'ям загінулых у сувязі з іх незаменнымі стратамі.

Der Spiegel: размяшчэнне ўкраінскіх бежанцаў у ФРГ стала «бізнесам на людской бядзе»

Нядобрасумленныя нямецкія бізнесмены выкарыстоўваюць украінскіх бежанцаў для сваёй выгады, навязваючы ім дагаворы з непад'ёмнымі цэнамі на жыллё. Аб гэтым піша часопіс Der Spiegel.

Паводле інфармацыі выдання, адзін з абуральных выпадкаў здарыўся ў горадзе Байройт у Баварыі. Там у гатэлі «Штайн» размяшчалі бежанцаў у Украіны, але пры гэтым за месяц знаходжання патрабавалі больш за 1,5 тысячы еўра.

«Арэндадаўца запатрабаваў 1285 еўра за больш прасторны былы двухспальны нумар. Пры гэтым на арэнду без уліку камунальных плацяжоў прыпадае 920 еўра, да гэтай сумы дадаецца плата за карыстанне мэбляй — 95 еўра ў месяц, а таксама камунальныя плацяжы — 270 еўра», — гаворыцца ў артыкуле.

Таксама журналісты высветлілі, што ў акрузе Бёблінген арэндадаўца запатрабаваў за трохпакаёвую кватэру ў былым гатэлі 1150 еўра, пры гэтым у доме вяліся будаўнічыя работы, а ў кватэры не было кухні.

«Падобна, што бізнес на людской бядзе прыносіць нядрэнны прыбытак», — піша аўтар публікацыі.

ГРЫБНЫЯ МЕСЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кілаграмовыя баравікі таксама можна назваць традыцыйнай восеньскай тэмай. У самым грыбным з нядаўніх, 2019 годзе, такі баравік быў знойдзены ў Брэсцкай вобласці. Тады грыбнікі ў розных рэгіёнах Беларусі адшукалі і яшчэ некалькі грыбоў-гігантаў — напрыклад, чырвонагаловік, якога аднаго хапіла б на цэлы рондаль грыбнага супу. Праўда, варта памятаць, што перарослыя грыбы могуць быць небяспечныя для здароўя, папярэджваюць медыкі. Лепш усё ж выкарыстоўваць у ежу грыбкі невялікія і маладыя. А што датычыцца грыбных месцаў... Калі вы не спецыяліст «ціхага палявання», то самым грыбным, мабыць, будзе найбліжэйшы рынак. Іншая справа, што грыбы заўсёды былі досыць дарагім ласункам, а гэтай восенню — асабліва.

Баравікі, лісічкі, рыжыкі...

— Грыбоў у лесе няшмат, — дзеліцца прадавец, тлумачачы дарагоўлю свайго тавару. — Можна сказаць, зусім няма. Паўтара вядра — гэта хіба многа?

Большасць баравікоў, падбярозавікаў і лісічак прыбылі ў сталіцу з Віцебшчыны.

— Віцебская вобласць. І журавіны адтуль. Свежанькія. На выхадных збірала. Ёсць сушаныя баравікі і падбярозавікі — адчуйце, які пах!

Лясныя грыбы — гэта вам не «пластыкавыя» прыручаныя шампіньёны. Іх смак і водар — яркія і выразныя, а знешні выгляд выклікае жаданне што-небудзь смачненькае прыгатаваць, нават калі вы не фанат кулінарыі. Выбіраць грыбы прадаўцы раяць па паху (яны і сырымі павінны пахнуць так, каб іх захацелася з'есці). І навобмацак: кожны грыбок павінен быць шчыльненькім і пругкім — пры націсканні на капялюшык не павінна заставацца ўвагнутасцяў. «Патанняе» грыбы таксама доўгая ножка — з пункту гледжання кухарскага мастацтва, харчовую каштоўнасць уяўляе ў першую чаргу капялюшык. Ён павінен быць сухі, чысты, матавы, без плямак і слізі.

Прывабнасці лясным грыбам для пакупніка дадае і іх «эксклюзіўнасць»: шампіньёны і вешанкі ў продажы круглы год, а баравікамі папесціць сябе можна толькі восенню. Праўда, цэны на дары лесу ў гэтым годзе кусаюцца мацней.

Прадаюць грыбы пластыкавымі вядзерцамі грам на 300—350. Або літровымі слоічкамі. Цана адна і на лісічкі, і на баравікі, і на падбярозавікі — 25 рублёў за вядзерца. Буйныя баравікі таннейшыя — 15 рублёў за вядзерца: якраз па прычыне іх памераў у вядро змяшчаецца ўсяго штучак 6-7.

— Паветра шмат атрымліваецца, шчыльна іх не ўтрамбуеш, таму і кошт ніжэйшы, — кажа прадавец. — Але вы паглядзіце, колькі «мяса» ў капялюшыках! — дадае яна.

Грыбы сапраўды называюць «лясным мясам «з-за ўтрымання ў іх расліннага бялку. Але заўважым, што, з пункту гледжання кулінарнай навукі, вялікія грыбы — не лепшы варыянт. Кухары адзначаюць, што аптымальны памер белага грыба для самых смачных страў — з дыяметрам капялюшыка не больш за 7 см.

Ваўнянкі і рыжыкі — па пяць рублёў за вядзерца.

Ваўнянкі і рыжыкі прадаюць па больш дэмакратычным кошце — 5 рублёў за вядзерца. Але важна памятаць, што ваўнянкі, напрыклад, належаць да ўмоўна-ядомых грыбоў (сямейства сыраежкавыя), а таму патрабуюць асаблівага прыгатавання.

— Што рабіць з ваўнянкамі? Хтосьці соліць, хтосьці смажыць. Так, іх адварваць трэба спачатку. Дык я любыя грыбы спачатку вару! — тлумачыць жанчына за прылаўкам.

Рыжыкі — цалкам ядомыя грыбы з выдатнымі смакавымі якасцямі, але пасля тэрмічнай апрацоўкі яны выглядаюць не занадта прывабна, адсюль і кошт.

А вось вядзерца маслят аддаюць за 10 рублёў.

— Усе чысценькія, вам застанецца толькі прамыць!

Захоўваюцца свежыя грыбы, дарэчы, 5 сутак пры +5, удвая менш — пры +10 і ўсяго 5-6 гадзін пры +15—18 градусах. Жадаючы падоўжыць тэрмін захоўвання, іх замарожваюць, сушаць або закатваюць у банкі.

Можна адразу купіць сушаныя баравікі — сушаць іх у электрасушылцы, кажуць прадаўцы. Цана — таксама 25 рублёў, але ўжо за 100 г. У пакетах, у якія фасуюць сушаныя баравікі, грам 150—170 (выкласці прыйдзецца рублёў 30—35). Такі ж пакецік чырвонагаловікаў аддаюць за 20 рублёў.

У асартыменце свежых грыбоў на Камароўцы пераважаюць лісічкі. Гэта ўжо другі і апошні сёлета ўраджай. Летнія лісічкі менш па памеры і больш светлай афарбоўкі. Восеньскія — буйнейшыя і валодаюць больш насычаным смакам. Іх часам бяруць на закруткі. Хоць у гэтым годзе, улічваючы кошт (тыя ж 25 рублёў за маленькае вядзерца), — гэта раскоша.

— На закруткі бяру, — дзеліцца пакупніца. — Раней любіла збіраць грыбы сама, цяпер не магу — баляць ногі. Пастаўлю пару слоічкаў салаты з лісічкамі на зіму.

Есці або не есці?

І вось тут узнікае пытанне: а ці варта плаціць такія грошы за прадукт, пра які дыетолагі і гастраэнтэролагі часцей гавораць з пазіцый засцярогі? Ці не бяспечнейшыя шампіньёны, да таго ж значна больш танныя? Яны, дарэчы, на той жа Камароўцы па 6-7 рублёў за кілаграм...

Усе мы не раз чулі, што склад макра- і мікраэлементаў ядомых грыбоў напрамую залежыць ад месца, дзе яны былі сабраныя (дакладней, ад складу глебы, на якой раслі). Грыбы ўтрымліваюць солі цяжкіх металаў і іншыя небяспечныя для здароўя рэчывы, так што калі іх збіралі, напрыклад, у лясочку каля аўтамагістралі, імі можна атруціцца. І гэта аргумент на карысць куплі лясных грыбоў менавіта на буйных рынках, дзе адбываецца кантроль бяспекі прадукту. Таксама ўрачы рэкамендуюць прасіць у прадаўца дакументы, якія пацвярджаюць праходжанне гэтага кантролю. Акрамя таго, нават зусім бяспечныя і «чыстыя» грыбы ўсё роўна з'яўляюцца «цяжкай» ежай. Нават у элітных баравіках змяшчаецца шмат хітыну — клятчаткі, якая цяжка пераварваецца. Таму медыкі не раяць дзецям (аж да падлеткавага ўзросту) ужываць у ежу грыбы. Як і цяжарным жанчынам, і людзям з хваробамі страўніка і кішэчніка. Хоць што датычыцца дзяцей, тут меркаванні медыкаў і бацькоў, бадай, разыходзяцца. Грыбы — адзін з тых прадуктаў, які любіць большасць дзяцей, і ў Беларусі прынята ўключаць іх у рацыён досыць рана.

Справа ў тым, што лясныя грыбы валодаюць і некалькімі, бясспрэчна, карыснымі для здароўя якасцямі. Папершае, яны ўтрымліваюць досыць шмат вітаміну D, якога ў Беларусі традыцыйна не хапае, а ён адказвае за трываласць касцей, гарманічны рост і развіццё дзіцяці, а таксама за добры настрой дарослых. Больш за ўсё гэтага вітаміну ў белых грыбах. Акрамя таго, баравікі і яго лясныя «браты» багатыя вітамінамі групы В (B_2, неабходным нервовай і рэпрадуктыўнай сістэмам, і B_3, які станоўча ўплывае на сардэчна-сасудзістую сістэму і зніжае ўзровень халестэрыну). Да таго ж сучасныя даследаванні даказваюць, што лясныя грыбы (у першую чаргу белыя) пры ўжыванні ў ежу падтрымліваюць і ўмацоўваюць імунітэт. Яны ўтрымліваюць прабіётыкі, нармалізуюць работу кішэчніка, а праз яго — усіх іншых органаў і сістэм.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

У тэму

Асцярожна: грыбны сезон!

Да катэгорыі людзей, што з нецярпеннем чакаюць наступлення чарговага «грыбнога сезона», наўрад ці можна аднесці медыкаў. Для іх ён азначае магчымы рост харчовых атручванняў (пры тым, што атручванне грыбамі — адно з самых небяспечных). Бо ў лес на «ціхае паляванне» ў сезон часам адпраўляюцца і тыя, хто не ў стане адрозніць ядомыя грыбы ад умоўна-ядомых або нават атрутных.

— Адрозніць атрутны грыб ад неядавітага часам няпроста нават для знаўцаў. Правілы і прыкметы, якія выкарыстоўваюцца ў народзе, ненадзейныя, ды і адзін і той жа від можа валодаць рознай таксічнасцю ў залежнасці ад месца і часу збору, — адзначае **валеолаг Лілія КАЦЭР**. — Атручэнне можа адбыцца як ад атрутных грыбоў — мухамораў, бледных паганак, ілжывых апенек, так і ад ядомых, калі яны сапсаваныя: пакрытыя сліззю, доўга захоўваліся. Між іншым, кіпячэнне не разбурае атрутных рэчываў, якія знаходзяцца ў грыбах.

Напрыклад, можна зблытаць ілжывыя апенькі з сапраўднымі, адзначае спецыяліст.

— Каб гэтага не адбылося, трэба ведаць, што ў ядомых апенек паверхня капялюшыка карычнявата-жоўтая, а на ножцы ёсць кольцападобная плёнка. У ілжывых апенек колер капялюшыкаў чырванаваты ці жоўта-зялёны, а кольца на ножцы адсутнічае. На белыя грыбы вонкава вельмі падобныя жоўцевы і сатанінскі. Адрозніць іх можна па колеры ніжняга боку капялюшыка. Калі ён не жоўты, а ружовы або чырвоны, то гэта атрутны грыб. Акрамя таго, капялюшык белага грыба на зломе не мяняе свайго колеру, а калі разламаць капялюшыкі жоўцевага і сатанінскага грыбоў, то яны ў месцы залому спачатку пачырванеюць, а затым счарнеюць. У цэлым большасць атрутных грыбоў маюць зялёнае адценне пласцінак і непрыемны пах.

Каб пазбегнуць атручвання:

- Не варта ўжываць у ежу невядомыя грыбы.
- Не трэба збіраць старыя або вельмі маладыя грыбы, бо ў іх недастаткова выразна выяўленыя знешнія прыкметы. Да таго ж старыя грыбы назапашваюць атрутныя рэчывы, у тым ліку шкодныя для чалавека прадукты раскладання бялкоў.
- Не збірайце і сухія грыбы — абязводжаны грыб назапашвае таксіны.
- Не набывайце лясныя грыбы каля аўтадарог і на стыхійных гандлёвых пунктах. Купляць гэты ласунак варта там, дзе грыбы праходзяць поўны кантроль.

Прыкметы атручвання грыбамі могуць з'явіцца на працягу 30 хвілін пасля іх ужывання, а могуць — і праз некалькі сутак. Сімптомы — галавакружэнне, млоснасць і ваніты, дыярэя, моцная смага, курчы, тахікардыя, ссіненне вуснаў і пазногцяў, пахаладанне рук і ног, парушэнне дыхання і сардэчнай дзейнасці. Пры першых сімптомах не чакайце развіцця падзей, а выклікайце хуткую дапамогу!

— Каб супрацьстаяць праявам атручвання, што развіваюцца хутка, да прыезду медыкаў прамыйце страўнік, прымусіўшы хворага выпіць шмат вады, а затым выклікаўшы ваніты, — распавядае Лілія Эдуардаўна. — Затым дайце ўдарную дозу сарбентаў (1 таблетка актываванага вугалю на 10 кілаграмаў вагі). Калі ў хворага няма паносу, яму можна прыняць слабіцельнае. Адной з важных мер першай дапамогі пры атручванні з'яўляецца прадухіленне парушэння кровазвароту. Для гэтага да ног пацыента неабходна прыкласці цёплы кампрэс. Пастаянна давайце хвораму піць як мага больш вады. Вялікая колькасць вадкасці дапаможа ачысціць страўнік і вывесці з арганізма шкоднасныя таксіны. Важна не пакідаць хворага, рэгулярна правяраць яго тэмпературу і ціск да прыезду ўрачоў.

Надвор'е

УНАЧЫ ЎЖО ЗАМАРАЗКІ, А РАНІЦАЙ МЕСЦАМІ СУЦЭЛЬНЫ ТУМАН

Другі месяц восені пачаўся з халоднага дажджу, а на наступным тыдні прагназуюцца начныя замаразкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу надвор'е будзе фарміраваць грэбень антыцыклону. Яго дажджавыя хмары будуць абыходзіць нашу краіну бокам, таму чакаецца адносна сонечная і без істотных ападкаў надвор'е. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 12 градусаў да 18 цяпла.

Самы цёплы дзень на гэтым тыдні будзе якраз у суботу. У гэтыя суткі, пры зменнай воблачнасці, істотных ападкаў па краіне не чакаецца. Толькі ўдзень да паўночна-заходніх раёнаў краіны наблізіцца атмасферны фронт, які праявіць сябе кароткачасовымі дажджамі. Ноччу і раніцай месцамі па краіне будуць згушчацца туманы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 1 градуса да плюс 8, а да сярэдзіны дня паветра па краіне прагрэецца да плюс 13—20 градусаў.

Ды яркае сонейка доўга радаваць не будзе. Ужо ў нядзелю Беларусь апынецца пад пераважным уплывам франтальнага падзелу, які ссоўваецца з захаду на ўсход краіны. Павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць. У начныя і ранішнія гадзіны на большай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы. Уначы тэмпература паветра складзе плюс 4—10 градусаў, удзень не перавысіць 9—16 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня франтальныя падзелы пакінуць нашу тэрыторыю, пры гэтым выцесняць за межы краіны цёплыя паветраныя масы. І адразу пахаладае. Будзе панаваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраванага ў прахалоднай паветранай масе паўночных шырот.

У панядзелак прагназуецца без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1—6 градусаў, месцамі сіноптыкі абяцаюць начныя замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў. Максімальная тэмпература днём складзе плюс 10—17 градусаў.

У аўторак уначы будзе без ападкаў, днём у асобных раёнах краіны пад уплывам малаактыўнага франтальнага падзелу магчымыя невялікія кароткачасовыя дажджы. Ноччу і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 2 да плюс 7 градусаў, а ў заходніх раёнах — да плюс 9 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Настассі ГРУК.

У ЧАКАННІ СТАРТУ

Завяршыўся здымачны марафон аднаго з галоўных тэлешоу сезона. Напярэдадні здымак кастынгу быў вызначаны шорт-ліст канкурсантаў (сёлета сярод іх таленты з 10 краін свету), а ўжо падчас прамых эфіраў тэлеаўдыторыя будзе шукаць «Фактар.BY».

Нагадаем, склад настаўнікаў шоу сёлета застаўся нязменным — у яго ўвайшлі Сярога, Вольга Бузава, Руслан Аляхно і Сяргей Саседаў. А вось адбор для саміх канкурсантаў быў больш жорсткім, чым летась. Цяпер ужо ў мінулым тыдзень выпрабавання камерамі, інтэрв'ю, сустрэчамі тэт-а-тэт з настаўнікамі праекта і ўскладненыя «сюрпрызы» трэніровачнага лагера. У выніку праз вакальнае «сіта» прайшлі 160 прэтэндэнтаў на выяўленне «Фактар.BY».

Трэба адзначыць, што ў новым сезоне праект пашырыцца самастойным дапаўненнем для канкурсантаў паважанага ўзросту «60+», але яно з'явіцца на экранах ужо пасля асноўнага конкурсу, хутчэй за ўсё, не раней вясны. Увогуле сёлета стваральнікі шоу-праекта абяцаюць свежы фармат і фірменны драйв, у атмасферы якіх знакамітыя настаўнікі і іх падапечныя зноў сыдуцца на музычнай арэне і будуць змагацца за права стаць артыстам на вялікай сцэне. Стартуе шоу «Фактар.BY» ў тэлеэфіры ў канцы кастрычніка, калі даведаемся, як і хто пракладаў свой шлях да поспеху.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 156

Фінішаваў юбілейны конкурс «Мікалай Бельчыкаў — 75», зладжаны бюлетэнем «Альбіна» да юбілею вядомага беларускага майстра шахматнай кампазіцыі. Спаборніцтва праводзілася ў раздзеле двухходовых задач. Паступіла 49 кампазіцый ад 25 аўтараў з 9 краін (Азербайджана, Беларусі, Германіі, Іспаніі, Італіі, Расіі, Румыніі, Славакіі і Чэхіі). Суддзя Віктар Зайцаў (Гомель) размеркаваў ацэнкі наступным чынам.

Прызы: I і IV — Павел Мурашоў (Расія); II — Міхаіл Храмцэвіч і Міхаіл Кошаль (Беларусь); III — Міхаіл Храмцэвіч.

Пачэсныя водгукі: I — Чэслаў Якубоўскі (Беларусь); II — Мікалай Быкаў (Беларусь); III — Павел Мурашоў; IV — Уладзімір Кажакін, Алёна Астаф'ева (Расія); V — Аляксандр Варыцкі (Беларусь).

Пахвальныя водгукі: I і III — Мігель Урыс (Іспанія); II — Мікалай Быкаў; IV — Золтан Лабаі (Славакія) і Відадзі Заманаў (Азербайджан); V — Марка Гуіда (Італія).

Наступная задача атрымала ў конкурсе першы прыз. Аўтар — Павел Мурашоў.

Белыя: Kpf1, Фh3, Лb4, Лh6, Cb8, Kd8, Kf4, пп. c5, d3, d7, e3, e4 (12).

Чорныя: Kpe5, Ле7, Лf7, Ka4, Кс7, пп. b5, b7, d5, d6, f5 (10).

Мат за 2 хады.

Падманныя сляды: 1. Фh4? ~ 2. Kg6x. 1...de 2. d4x, 1...Ле6 2. K:f7x, 1...Лf6 2.Ф:f6x, 1...Лg7 2. Ф:f6x, але 1...fe!; 1. Л:d6? ~ 2. Kg6x, 1...fe 2. d4x, 1...Ле6 2. Л:e6x, 1...Лf6 2. Л:d5x, 1...Лg7 2. Ф:f5x, 1...Ке6 2. Л:e6x, але 1...K:c5! Рашае 1. Фf3! ~ 2. d4x, 1...fe 2. Kg6x, 1...Ке6 2. C:d6#, 1...dc 2. C:c7x, 1...d4 2. edx

А вось задача Аляксандра Варыцкага з Брэста, адзначаная пятым пачэсным водгукам ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Kpb4, Фf6, Лh4, Cf2, Кс2, Ке4 (6).
Чорныя: Kpe2 (1).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Батумі (Грузія) прайшлі дзіцячыя чэмпіянаты свету да 8—12 гадоў. Сярод дзяўчынак да 10 гадоў залаты медаль заваявала мінчанка Ніка Венская — 9,5 бала з 11.

У Румыніі адбыліся чэмпіянаты свету да 14—18 гадоў. З беларускіх шахматыстаў найлепшыя вынікі паказалі Юлія Лявонава (13-е месца сярод дзяўчат да 14 гадоў) і Ксенія Зелянцова (14-е месца да 18 гадоў).

Сяргей Жыгалка фінішаваў адзінаццаты на турніры ва Уладзівастоку (32 удзельнікі). Ён жа ў некалькіх турнірах па бліцы на сайце chess.com заняў адпаведна 17-е месца з 397, 4-е з 321, 18-е з 419 і 12-е з 281.

На Мемарыяле Аляксандра Панчанкі ў Чэлябінску (128 гульцоў) Міхаіл Нікіценка заняў 3-е месца, Аляксей Фёдараў — 22-е, Вячаслаў Зарубіцкі — 26-е.

На Мемарыяле Генадзя Лібава ў Мінску (91 удзельнік) перамог Мікіта Маёраў — 9 балаў з 9! 2—4 месцы (па 7 балаў) падзялілі Сяргей Жыгалка, Аляксей Аляксандраў і Арцём Стрыбук, 5—8 месцы (па 6,5 бала) — Сяргей Азараў, Андрэй Жыгалка, Вячаслаў Зарубіцкі і Максім Царук.

* * *

Сваю новую задачу прапануе наш чытач Сяргей Дарошчанка.

Белыя: Kpe2, Ла8, Cd1, Ch6, Кс6, Kg8 (6).
Чорныя: Kpe8, Лd8, Кс8, Kd7, пп.e4, f7 (6).
Мат за 2 хады.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Лh1! Крс2 2. Се3 Крс3 3. Се2, 1...Крd2 2. Крb2 Крd1 3. Се3. Правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

МАЙСТРЫ, КУМІРЫ І ІХ ЧАС

